Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
фота аўтара

# Зоркі ў лабірынце

**Рэспубліканская выстаўка работ лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі адкрылася ў сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры". У яе адмысловым лабірынце творы маладых айчынных зорак жывапісу, дызайну, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога і фотамастацтва прабудуць да 13 сакавіка. Арганізатары праекта — Міністэрства культуры краіны, спецыяльны фонд Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, Інстытут культуры Беларусі, БДУ культуры і мастацтваў.**



Госці вернісажа, сярод якіх былі намеснік старшыні Савета спецыяльнага фонду, намеснік міністра культуры Беларусі Тадэуш Стружэцкі ды старшыня экспертнамастацкай камісіі фонду, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхал Баразна, звярнулі ўвагу на новыя тэндэнцыі ў фарміраванні традыцыйнай справаздачнай экспазіцыі, адзначылі высокі ўзровень прадстаўленых твораў. З афіцыйных выступленняў і кулуарных размоў высноўвалася думка, што моладзь дзякуючы фонду нават у найскладаных для творчай інтэлігенцыі эканамічных варунках адчувае падтрымку на дзяржаўным узроўні, а значыць — сваю запатрабаванасць.

Сёлетняя выстаўка дэманструе не толькі перспектыву развіцця традыцый беларускай школы выяўленчага мастацтва і годны прафесійны ўзровень яе спадкаемцаў, але і досыць адказнае, удумлівае стаўленне моладзі да самога сэнсу творчай дзейнасці. Зрэшты, і раней у стракатым сузор'і ўдзельнікаў гэтага штогадовага праекта вылучаліся асабліва яркія імёны (Алеся Скарабагатая, Вольга Мельнік, Ганна Конанава, Дзяніс Чубукоў, Павел Лявонаў), якія запаміналіся адразу, а потым прыцягвалі ўвагу на новых вернісажах. Вось і тут пазнаеш манеру кожнага з маладых майстроў, разглядаючы сакавіты "фарбапіс" Ганны Конанавай-Грыгалец, паглыбленасць ляўкасаў Вольгі Мельнік-Малахавай, эстэцкія сюжэты Аляксандра Даманава, характарнасць персанажаў фотамастака Міколы Купрыча. А пабач — новае: псіхалагічны партрэт "Зіма" Вікторыі Шыдлоўскай, жывапісныя пошукі Кацярыны Шымановіч, Вольгі Кісялёвай, Паліны Корзун, "жывы", аснашчаны механізмамі артаб'ект Аляксандра Балдакова, кампазіцыі з металу Паўла Малаткова, Івана Хамініча, Віктара Старухіна (уражвае філасофія яго "Нараджэння" — тонкі, падобны да вялікай лямпачкі, шкляны сасуд, замкнёны ў куб з кароткіх і колкіх сталёвых пруткоў).

"Адбор на выстаўку быў як ніколі строгі, — зазначае дырэктар галерэі Наталля Барсукова. — Таму і няма, як некалі здаралася, яўна вучнёўскіх малюнкаў. Тут работы толькі тых навучэнцаў, студэнтаў, магістрантаў (са славутых "Глебаўкі", гімназіі-каледжа імя І. Ахрэмчыка, БДАМ, БДУКіМ), якія ўжо звязалі свой прафесійны лёс з творчасцю".

*На здымку: Ганна Конанава-Грыгалец "Guajira Guantanamera" (2012, палатно, алей).*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ